В. В. ДАНІЛОВІЧ

# ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЯ СПАДЧЫНА – КРЫНІЦА ДЛЯ ВЫХАВАННЯ ПАТРЫЯТЫЗМУ

Захаванне гістарычнай памяці, веданне духоўнай спадчыны продкаў адыгрывае надзвычай важную ролю ў сучасным грамадстве. Гісторыя нашай Радзімы – невычэрпная крыніца для выхавання патрыятызму. Менавіта важнасць фарміравання патрыятычных пачуццяў як адной з першасных неабходных асноў паспяховага развіцця нашай краіны неаднаразова падкрэсліваў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка.

Увогуле, дзякуючы мэтанакіраванай дзяржаўнай палітыцы, актыўнаму ўдзелу ўсяго беларускага народа шмат зроблена і дасягнута ў нашай краіне ў апошнія 20 гадоў. Беларуская мадэль сацыяльна-эканамічнага развіцця прызнана нават нашымі апанентамі. Дзяржава вялікую ролю адводзіць забеспячэнню занятасці насельніцтва, паляпшэнню спартыўнай і турыстычнай інфраструктуры, медыцынскага абслугоўвання, бытавых і камунальных паслуг для жыхароў не толькі гарадоў, але і сельскіх рэгіёнаў.

Не з'яўляецца выключэннем і Свіслацкі раён, разам з тым, не магу не адзначыць, што значная ўвага надаецца не толькі сацыяльна-эканамічнаму развіццю, але і пытанням захавання гісторыка-культурнай спадчыны. Усё гэта несумненная заслуга працавітых жыхароў Свіслаччыны на чале са старшынёй Свіслацкага раённага выканаўчага камітэта Уладзімірам Сяргеевічам Аніщчыкам.

Кожны рэгіён Беларусі мае сваю адметную гісторыю і непаўторны каларыт, у тым ліку і Свіслацкі край – адзін з найпрыгажэйшых куткоў Гродзенскай вобласці. Старажытны беларускі горад Свіслач за сваю шматвяковую гісторыю перажыў войны, паўстанні, рэвалюцыі, перыяды росквіту і заняпаду, змены ўладальнікаў і адміністрацыйнага статусу. Зараз Свіслач займае пачэснае месца сярод іншых гарадоў Рэспублікі Беларусь.

Археалагічнае вывучэнне Свіслаччыны пачалося ў XIX ст. і дазваляе аднавіць многія старонкі яе старажытнай гісторыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Даследуецца гісторыя Свіслачы і па пісьмовых крыніцах, дзе гэты населены пункт неаднаразова ўзгадваецца. Гістарычныя матэрыялы адлюстроўваюць змены дзяржаўнай прыналежнасці Свіслачы: спачатку гэта цэнтр удзельнага княства, потым далучылася да Вялікага Княства Літоўскага, а пасля трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай апынулася ў складзе Расійскай імперыі. Зручнае геаграфічнае становішча садзейнічала росту палітычнага і эканамічнага значэння рэгіёну. У розныя перыяды Свіслач знаходзілася ва ўладанні вялікіх князёў літоўскіх, потым родаў Хадкевічаў, Заслаўскіх, Крышпінаў, Тышкевічаў.

Адметным у жыцці Свіслачы быў час, калі ў канцы XVIII – пачатку XIX ст. яе гаспадаром з’яўляўся Вінцэнт Тышкевіч. Менавіта гэтаму ўладальніку Свіслач абавязана сваім эканамічным і культурным росквітам. Вінцэнт Тышкевіч усё жыццё прысвяціў Свіслачы, здолеў адбудаваць і ўпрыгожыць яе, правёў перапланіроўку, у цэнтры пабудаваў вялікую гандлёвую плошчу для арганізацыі кірмашоў. На Свіслацкі кірмаш, які па таварна-грашоваму абарачэнню займаў другое месца ў Беларусі, прыязджалі купцы з замежных краін. Свіслач стала таксама вядомым цэнтрам музычна-тэатральнай культуры. Але ў першую чаргу Свіслач у XIX ст. славілася сваёй адукацыйна-асветніцкай значнасцю і ў гэтых адносінах перавышала некаторыя гарады. Нельга не пагадзіцца са словамі гісторыка Яўстафія Арлоўскага, што заснаванне Свіслацкай гімназіі было «самай капітальнай справай» Вінцэнта Тышкевіча. Гімназія стала першай свецкай навучальнай установай у Гродзенскай губерніі, з яе выйшла шмат вядомых людзей, сярод якіх адзін з заснавальнікаў манголазнаўства ў Расійскай імперыі Восіп Кавалеўскі, пісьменнік Юзаф Крашэўскі, мастакі Напалеон Орда і Януарый Сухадольскі, мемуарыст Леан Патоцкі, вачыма якога можна зазірнуць у мінулае Свіслачы і іншыя.

Свіслацкі край – гэта мясцовасць, якая непасрэдным чынам звязана з падзеямі паўстання 1863–1864 гг. і з асобай Кастуся Каліноўскага, выпускніка Свіслацкага павятовага вучылішча, у якое была пераўтворана Свіслацкая гімназія. Многія населеныя пункты Свіслацкага краю былі сведкамі падзей паўстання. Тут распаўсюджвалася «Мужыцкая праўда».

Важкі ўклад у фарміраванне адукацыйнай прасторы Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. унесла Свіслацкая настаўніц-

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

кая семінарыя. Яна падрыхтавала не толькі пакаленні народных настаўнікаў, але і такіх вядомых дзеячаў, як народны камісар адукацыі БССР Антон Баліцкі, міністр адукацыі БССР Платон Саевіч, педагог і пісьменнік Кандрат Лейка і іншыя.

Пачатак XX ст. прынёс Свіслачы новыя выпрабаванні: Першую сусветную вайну і акупацыю краю германскімі войскамі. Падзеі польска-савецкай вайны прывялі да таго, што Свіслач на працягу 1921–1939 гг. апынулася пад уладай Польшчы. Прыкметны след у гісторыі Свіслаччыны ў гэты перыяд пакінула дзейнасць Беларускай сялянска-работніцкай грамады і Таварыства беларускай школы, якія вялі барацьбу за нацыянальнае вызваленне і ўз’яднанне Заходняй Беларусі з БССР.

Адным з найбольш цяжкіх выпрабаванняў для Свіслацкага краю стала Вялікая Айчынная вайна. Нямецка-фашысцкая акупацыя прынесла Свіслаччыне велізарныя страты: загінула больш за 5000 жыхароў, былі разбураны жылыя дамы, культурна-бытавыя ўстановы, школы, бальніцы, культавыя будынкі. Але мясцовае насельніцтва не скарылася: вялася масавая барацьба з ворагам, дзейнічалі партызанскія атрады і падпольныя групы, якія ўнеслі важкі ўклад у агульную перамогу над германскім нацызмам.

Пасля вайны, нягледзячы на складаныя грамадска-палітычныя ўмовы, недахоп фінансавых сродкаў і кваліфікаваных кадраў, рэгіён адрадзіўся і плённа развіваўся, дзякуючы самаадданай працы мясцовых жыхароў. Галоўнай сферай эканомікі з’яўлялася аграрная вытворчасць. У гарадскім пасёлку Свіслач вялося актыўнае будаўніцтва, расла яго плошча, адбывалася добраўпарадкаванне, назіраўся ўздым асветы і культуры.

Новы этап у гісторыі Свіслачы пачаўся з наданнем ёй у 2000 г. статусу горада, што можна расцэньваць як заканамерную з’яву, прызнанне яе дасягненняў у сацыяльна-эканамічным і культурным развіцці.

Дынамічным і насычаным падзеямі было жыццё Свіслаччыны і яе насельніцтва на працягу шматвяковай гісторыі. Адметны ўклад у развіццё нацыянальнай культуры ўносілі і працягваюць уносіць вучоныя, пісьменнікі, кампазітары, спевакі, мастакі, якія нарадзіліся, працавалі, вучыліся ці мелі пэўнае дачыненне да Свіслаччыны. Даследаванне ўкладу ураджэнцаў краю ў скарбонку нацыянальнай культуры – актуальная задача



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

сучаснай гістарыяграфіі. Неабходна працягваць працу па захаванні, далейшым вывучэнні і папулярызацыі помнікаў гісторыі і культуры, якія маюцца ў Свіслацкім раёне. Шматлікія старонкі гісторыі рэгіёну ўжо напісаны, але многія з іх яшчэ чакаюць сваіх даследчыкаў.

Сённяшняя канферэнцыя, безумоўна, будзе карыснай у справе нацыянальна-патрыятычнага выхавання, пашырэння ведаў аб гісторыі Свіслаччыны і ўсёй Беларусі, умацавання пачуццяў гонару і любові да нашай Бацькаўшчыны.

М. А. БЯСПАЛАЯ

## УМОВЫ СТВАРЭННЯ І КІРУНКІ ДЗЕЙНАСЦІ ВІЛЕНСКАГА МУЗЕЯ СТАРАЖЫТНАСЦЕЙ

Кожная новая з'ява сацыякультурнага жыцця ўзнікае пры наяўнасці пэўных умоў. Для фарміравання перадмузейных збораў, а затым на іх аснове – музеяў, неабходна, на думку музеёлагаў, некалькі ўмоў: па-першае, аб'яднанне зацікаўленых у гэтым асоб, па-другое, існаванне сацыяльнага асяроддзя, здольнага ўспрымаць новыя ідэі, па-трэцяе, наяўнасць дастаткова ўстойлівай матэрыяльнай асновы як для стварэння, так і для функцыянавання музея. Азначаныя ўмовы праявіліся ў сацыякультурнай атмасферы многіх рэгіёнаў імперыі, у тым ліку беларускіх губерняў на сярэдзіну XIX ст.

Кіраўніцтва міністэрства асветы царскай Расіі адмоўна ставілiся да шматлікіх ініцыятыў інтэлігенцыі як вялікарускіх, так і ўскраінных губерняў. Незадавальненне выклікала імкненне вывучаць фальклор і этнаграфію мясцовага насельніцтва і, асабліва, публікацыі вынікаў даследавання. У той жа час многія прадстаўнікі вышэйшых колаў імперыі захапляліся пошукамі, калекцыяніраваннем і апісаннем старажытнасцей. Пад імі разумелі, галоўным чынам, артэфакты, знойдзеныя падчас археалагічных раскопак. У сталічных і мясцовых выданнях пачалі з'яўляцца публікацыі аб старажытнай матэрыяльнай культуры Полацка, Гародні, Камянца і інш.

У сярэдзіне XIX ст. у заможных колах беларускіх губерняў таксама склалася прыкметная група аматараў-даследчыкаў ста-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ